**“І я ўжо голас свой тут маю…”**

Эскпазіцыя прысвячаецца маладым паэтам і пісьменнікам Дзятлаўшчыны, якія друкуюцца ў раённай газеце, сустракаюцца з вучнямі школ, праводзяць творчыя сустрэчы з жыхарамі раёна.

**Ірына Анатольеўна Касянкова** – жыхарка Наваельні, настаўніца пачатковых класаў, паэтка. Бацька – беларус, маці – украінка, пазнаёміліся, калі былі на цаліне. Вярнуліся разам у родную вёску бацькі Сямёнавічы.

Скончыла Ваўкавыскае педвучылішча. Як жонка ваеннага вымушана была пакінуць Беларусь, доўгі час жылі ў Сібіры, у Краснаярскім краі, дзе пачынала свой педагагічны шлях.

Паэзія для Ірыны Анатольеўны – гэта асаблівы свет, у якім адлюстроўваецца жыццё, яго праблемы, мары. Шэраг вершаў прысвечаны школе, настаўнікам, прафесіі.

Як педагог імкнецца паказаць сваім вучням прыгажосць роднай мовы, чытае ім вершы сваіх любімых паэтаў Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, часам чытае таксама і свае.

**Алена Рыгораўна Абрамчык (Алена Голуб)** – нарадзілася 8 студзеня 1962 г. у в. Цынцавічы Вілейскага раёна Мінскай вобласці. У 1977г. скончыла Цынцаўскую васьмігадовую школу, у 1979 г. – Віленскую СШ №2 і адразу паступіла на філалагічны факультэт БДУ (аддзяленне рускай мовы і літаратуры), які скончыла ў 1984г. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў в. Гарбавічы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. У 1990г. пераехала ў Дзятлаўскі раён. Спачатку працавала карэспандэнтам раённай газеты “Перамога”, затым настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ №3 г. Дзятлава. З 2003г. працуе намеснікам дырэктара гімназіі №1 г. Дзятлава. Друкуецца ў раённай газеце “Перамога”, “Настаўніцкай газеце”, “Савецкай Беларусі”, “Роднае слова”, “Беларуская мова і літаратура”, “Кіраванне ў адукацыі”, “Настаўніцкая асвета”.

**Алёна Гоман** (псеўданім Алёна Дуброўская) выпускніца Хвінявіцкай СШ. У 2005 годзе скончыла філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.

Купалы,  атрымала спецыяльнасць настаўнік рускай мовы і літаратуры і дадатковую спецыяльнасць літаратурная работа ў газетах і часопісах.

Сваю працоўную дзейнасць пачынала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Раготнаўскай СШ, а з 2007 года працуе карэспандэнтам у рэдакцыі раённай газеты “Перамога”, асвятляе пытанні і праблемы культуры, медыцыны, курыруе рубрыку “Зямля пад белымі крыламі”.

“Жыць, верыць, любіць” – жыццёвае і прафесійнае крэда Алёны Дуброўскай. Піша апавяданні, эсэ, у якіх разважае і паднімае праблемы духоўнасці, маральна-этычныя праблемы.  Творы Алёны Дуброўскай былі змешчаны ў раённай газеце “Перамога”.

**Ірына Каўкель** скончыла СШ №3 г. Дзятлава, затым філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, атрымала спецыяльнасць настаўнік рускай мовы і літаратуры. Некаторы час працавала  па спецыяльнасці ў СШ №1, зараз працуе у рэдакцыі раённай газеты “Перамога” загадчыкам аддзела па асноўным накірунках дзейнасці.

У цэнтры ўвагі  нарысаў Ірыны Каўкель – людзі-працаўнікі, майстры-рукадзельнікі, іх жыццё, праца, захапленні, за якімі  аўтар прасочвае не толькі гісторыю рода чалавечага, вехі гісторыі раёна, але перш за ўсё багаты духоўны свет простага чалавека.

Ірына Каўкель працуе ў жанры пейзажных і партрэтных замалёвак: “Чалавек і яго справа”, “Аб людзях харошых”, “Юбіляры”, “Доўгажыхары”.

Спрабуе свае сілы  ў напісанні апавяданняў, вершаў, якія былі надрукаваны ў газеце “Перамога”.